ности возникновения этих событий на горизонте культурного опыта. Это историческое знание было неотъемлемой частью культуры и создавало своего рода перспективу объемного восприятия любого содержания.

С наступлением эпохи постмодернизма (постклассической культуры) произошла смена этой исторической (диахронической) логики на синхронию. Тезис об этой революционной перемене в методологическом основании культуры принадлежит Ф.Джеймисону.

Постмодернизм как принципиально новое состояние культуры, которое базируется на новых принципах взаимоотношений между элементами культуры, их статусом, функциями и способами возникновения, характеризуется новой культурной логикой - логикой "пространства". Эта смена заключается в том, что значительность, которая раньше была равномерно распределена между явлениями и смыслами разных культурных эпох (разных отрезков культурного прошлого), постепенно фокусируется на одной плоскости, которая может быть представлена как современность.

С этой точки зрения адекватное понимание и интерпретация культурных событий современности возможны лишь на основе их восприятия в синхронном , т.е. сосуществующем во времени (в настоящем времени), контексте, состоящем из аналогичных смыслов, ценностей, которые взаимодействуют и создают различные сочетания, порождают новые эффекты. В этом взаимодействии и заключается основное содержание культуры.

УДК 378.1.14

Н.Я.Савіцкая, старшы выкладчык кафедры беларускай мовы

## АДАПТАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ ДА ЎМОЎ ВНУ

Паміж школай і ВНУ маецца пераемнасць па даволі глыбокай прыкмеце — вучэнні як адным з відаў дзейнасці. На ўзроўні самых агульных мэт і задач у школьнікаў і студэнтаў таксама існуе несумненная пераемнасць: пошукі магчымасцей прымяняць свае задаткі і здольнасці; ідэйная скіраванасць зместу форм і метадаў навучання. Гэтая адаптацыя агульнага і вышэйшага ўзроўняў да вядомай ступені спалучаецца з пераемнасцю задач і мэт на мікраўзроўні, дзе адаптацыя адбываецца параўнальна без цяжкасцей (абавязковасць наведвання заняткаў, выкананне заданняў з неадтэрмінаваным кантролем, удзел у грамадскай працы і інш.). Аднак асноўным зыходным фактам у пераемнасці школы і ВНУ з'яўляецца псіхалогія вучэбнай дзейнасці.

Як аб'ект навучання і выхавання першакурснік з'яўляецца навучэнцам, чым і абумоўлены вядучыя рысы яго адаптацыі. Аб'ектамі актыўнага выхавальніцкага ўздзеяння аказваецца асоба студэнта і яго зносіны.

Паміж дзейнасцю навучэнца ва ўмовах ВНУ і школы існуюць значныя колькасныя і якасныя адрозненні. У ВНУ вышэйшая інтэнсіўнасць разумовай працы, большы аб'ём ведаў для засваення, больш дынамічныя змены ў раскладзе заняткаў; маецца, як правіла, рэзка выражаная нераўнамернасць нагрузкі, якая крайне ўзрастае ў перыяд сесіі. Якасныя адрозненні характарызуюцца рэзкім змяненнем круга прадметаў для вывучэння; нарэшце адбываецца рашучы падыход да асабістай адказнасці за свае ўчынкі. Пры гэтым стрыжнёвым пытаннем для кожнага студэнта з'яўляецца пытанне аб адпаведнасці яго намераў патрабаванням, якія прад'яўляюцца да асобы з боку будучай прафесіі.

Адаптацыя — гэта пераходны перыяд ад дзейнасці ва ўмовах школы да дзейнасці ў новых умовах — умовах ВНУ. Праблема адаптацыі складаецца з суадносін яе відаў.

У найбольш агульным разуменні адаптацыя — гэта "прыстасаванне арганізмаў да зменлівых умоў існавання". Такім вызначэннем ахопліваецца мноства адаптацыйных працэсаў у жывым свеце і ў складаных тэхнічных сістэмах. Паняцце адаптацыі ў кібернетыцы знаходзіцца ў адным радзе з паняццямі "гомеастаз", "мэта", "саманаладжванне", "аптымізацыя". Паняцце "адаптацыя" сярод іх з'яўляецца найбольш шырокім.

Адаптацыя мае сваёй асаблівасцю той узровень перабудоў у жывым арганізме, па дасягненні якога сістэма ажыццяўляе больш тонкія працэсы — навучанне, самаарганізацыю і інш.Істотна тое, што адаптацыя разумеецца ў гэтым выпадку як унутраная перабудова сістэмы, якая адбываецца пад уздзеяннем знешніх фактараў і забяспечвае магчымасць больш складаных перабудоў, узровень арганізацыі сістэмы.

Існуе шмат вызначэнняў паняцця “адаптацыя”. У сучаснай псіхалогіі яно вызначаецца так: "Адаптацыя (ад лац.adaptare — прыстасоўваць) — у шырокім сэнсе — прыстасаванне да навакольных умоў.” Адаптацыя чалавека мае два спектры — біялагічны і псіхалагічны. Першы спектр уключае прыстасаванне арганізма да ўстойлівых і зменлівых умоў асяроддзя. Псіхалагічны аспект адаптацыі (часткова перакрываецца паняццем сацыяльная адаптацыя) — прыстасаванне чалавека як асобы да існавання ў грамадстве (як у шырокім сэнсе, так і ў прымяненні да бліжэйшага сацыяльнага акружэння — грамадскай групы, працоўнага калектыву, сям'і). Адаптацыя — узаемадзеянне (у тым ліку зносіны) чалавека з людзьмі і яго актыўная дзейнасць. Важнейшым сродкам дасягнення псіхалагічнай адаптацыі з'яўляюцца агульная адукацыя і выхаванне, а таксама працоўная і прафесійная падрыхтоўка. Працэс псіхалагічнай адаптацыі праходзіць кожны чалавек у ходзе свайго індывідуальнага развіцця і прафесійна-працоўнага станаўлення.

Тэрмін "адаптацыя" сустракаецца ў рабоце Н.Д. Левітава толькі для апісання неадаптаванасці асобы, аднак адаптацыя суправаджае практычна кожны значны ўчынак любога чалавека, у тым ліку і пазітыўны. Н.Д.Левітаў услед за А.В.Вядзёнавым прыдае істотнае значэнне канфліктам як крыніцам пабуджэнняў да адаптацыйных перабудоў асобы, хаця пакідае працэс адаптацыі раскрытым. Н.Д.Левітаў сцвярджае, што неабходна стварыць сітуацыю, у выніку якой асоба, перажыўшы пэўны стан, набывае новую рысу характару.

Галоўнае ў адаптацыі — забеспячэнне адэкватнай перабудовы ўнутранай структуры асобы. Высокія адаптацыйныя магчымасці апасродкавана садзейнічаюць вучобе, непасрэдна дапамагаючы нармалізацыі адносін асобы са студэнтамі групы, курса, інтэрната і выкладчыкамі, а таксама дапамагаюць стварыць ураўнаважаны ўнутраны стан асобы.

У гэтай сувязі варта падкрэсліць такія моманты, як важнасць фарміравання адносін індывіда да групы для стварэння ў ёй правільнага псіхалагічнага клімату. Адаптацыя не лічыцца поўнай, калі асоба дасягнула аптымальнага спалучэння сваіх характарыстык, неабходных для выкання работы, але камунікатыўная адаптацыя яе яшчэ не завершана. "У адаптацыі назіраецца абавязковая суаднесенасць сваіх учынкаў з шырокім сацыяльным кантэкстам, а таму і ўзнікае задача пераадолення індывідам неадпаведнасцей паміж ім самім і мікраасяроддзем; веды, у прыватнасці, аказваюцца засвоенымі ў якасці сацыяльных норм"[6].

Такім чынам, у плане адаптацыі неабходны як сінтэтычны цэласны разгляд асобы, так і апора на змястоўныя бакі дзейнасці, зносін, асобы і свядомасці. Найбольшыя цяжкасці ў адаптацыі да ВНУ і яго метадаў — у студэнтаў першага курса, якая завяршаецца да другога курса.

У першакурсніка два шляхі адаптацыі да ВНУ: стыхійны і самастойнае авалоданне ініцыятывай вучэння, мэтанакіраванаеператварэнне ў "спецыяліста-студэнта". Першы шлях — гэта стыхійна-індывідуальная адаптацыя з дакладнай, але спецыфічнай мэтай, сканструяванай самім студэнтам. Другі часцей выбіраюць студэнты тых ВНУ, дзе адаптацыя заснавана на ўнутрывузаўскай мэце комплекснага характару — сфарміраваць узорнага студэнта. Абодва шляхі прыводзяць да стварэння з першакурсніка добрага ўдзельніка вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Адаптацыя працякае ў межах часу знаходжання ў ВНУ, забяспечваючы пераемнасць школы і ВНУ у цэлым пад уздзеяннем трох асноўных сацыяльна-псіхалагічных фактараў у іх адзінстве: апоры на характарыстыку асобы студэнта, выкарыстанні асаблівасцей абстаноўкі ВНУ і мэтанакіраваным рэгуляванні ўзаемаўплыву асобы і яго акружэння.

ЛІТАРАТУРА

1. Словарь иностранных слов. — 6-е изд. — М., 1964, с.22.
2. Управление, информация, интеллект/ Под ред. А.И.Берга. — М., 1976, с.20.
3. Психологический словарь/ Под ред. В.П.Зинченко, Б.Г.Мещерякова. — 2-е изд., перераб. и доп. — М.: Педагогика-Пресс, 1996, с.11-12.
4. Левитов Н.Д. О психологических состояниях человека. — М., 1964, с.292, 356, 357.
5. Веденов А.В. Роль внутренних противоречий и способов их преодоления// Вопросы психологии, 1959, № 1.
6. Бенедиктов Б.А.,Бенедиктов С.Б. Психология обучения и воспитания в высшей школе. — Мн.: Выш. шк., 1983, с.202.
7. Бенедиктов Б.А., Бенедиктов С.Б. Психология обучения и воспитания в высшей школе. — Мн.: Выш. шк., 1983, с.203.

УДК 808.26:37

Р.В.Міксюк, старшы выкладчык кафедры беларускай мовы

## АСНОЎНЫЯ ШЛЯХІ І СПОСАБЫ НАМІНАЦЫІ ЛЕКСІКІ

Тэрмінам “намінацыя” (ад лац. nominatio — найменне) называюць працэс стварэння моўных адзінак для называння фрагментаў рэчаіснасці і фарміравання адпаведных паняццяў пра іх у форме слоў, словазлучэнняў, сказаў. Гэтым тэрмінам называюць і вынік працэсу намінацыі — значную моўную адзінку.

Лясная лексіка як састаўная частка намінацыі навакольнага асяроддзя патрабуе даследавання ва ўсіх аспектах лінгвістыкі — семантыкі, этымалогіі, лінгвагеаграфіі, намінацыі і інш.

Намінацыя — гэта складаны працэс, які звязаны з апрадмечваннем чалавекам аб'ектыўнага свету, з вылучэннем і абагульненнем неабходнага і істотнага ў прадмеце, што і дазваляе адрозніваць адзін прадмет ці з'яву ад іншых. Але разам з тым намінацыя — гэта і працэс атаясамлівання з'яў рэчаіснасці. Назіраючы за лесам, чалавек прыйшоў да намінацыі паняцця "дрэва", бо ён змог адзначыць не толькі адрозненне па форме лісця, узросце, велічыні і інш., але і агульнае для ўсіх дрэў: наяўнасць цвёрдага ствала, галін, каранёвай сістэмы.

Лясная лексіка аб'ядноўвае вялікі клас слоў і словазлучэнняў, уключаючы тэрміны лесаводства, дэндралогіі, батанікі, сістэматыкі, марфалогіі, фізіялогіі, экалогіі і інш., дзе аб'ектам даследавання з'яўляецца раслінны арганізм.